## СПРАЖЭННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ

**Спражэнне** – гэта змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім (будучым простым) часе абвеснага ладу. У залежнасці ад сістэмы флексій дзеясловы маюць два спражэнні. Дзеясловы I і II спражэння адрозніваюцца сістэмай канчаткаў (гл. табліцу 1).

**Табліца 1**

| | | |
|---|---|---|
| I спражэнне | | |
| адзіночны лік | | |
| 1-я | -у (-ю) | няс-у, бяр-у, кіда-ю, піш-у |
| 2-я | -еш (-эш, -аш) | няс-еш, бяр-эш, кіда-еш, піш-аш |
| 3-я | -е (-э, -а) | няс-е, бяр-э, кіда-е, піш-а |
| множны лік | | |
| 1-я | -ём (-ем, -ом, -ам) | няс-ём, бяр-ом, кіда-ем, піш-ам |
| 2-я | -еце (-яце, -аце) | нес-яце, бер-аце, кіда-еце, піш-аце |
| 3-я | -уць (-юць) | няс-уць, бяр-уць, кіда-юць, піш-уць |
| II спражэнне | | |
| адзіночны лік | | |
| 1-я | -у (-ю) | хадж-у, гляджу, спл-ю, маўч-у |
| 2-я | -іш (-ыш) | ходз-іш, глядз-іш, сп-іш, маўч-ыш |
| 3-я | -іць (-ыць) | ходз-іць, глядз-іць, сп-іць, маўч-ыць |
| множны лік | | |
| 1-я | -ім (-ым) | ходз-ім, глядз-ім, сп-ім, маўч-ым |
| 2-я | -іце (-ыце) | ходз-іце, гледз-іце, сп-іце, маўч-ыце |
| 3-я | -аць (-яць) | ходз-яць, глядз-яць, сп-яць, маўч-аць |

Найбольш выразна вызначыць тып спражэння можна па форме 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку, а ў дзеясловах з ненаціскнымі канчаткамі – па форме інфінітыва. Да **II спражэння** адносяцца: усе дзеясловы на *-іць* (-*ыць*), акрамя аднаскладовых («ліць», «мыць», «шыць» і інш.) і ўтвораных ад іх; дзеясловы на -*ець* (-*эць*), калі *-е* (-э) не захоўваецца ў 1-й асобе адзіночнага ліку цяперашняга часу: «цярпець (цярплю)», «сядзець (сяджу)» і інш. (выключэнне – дзеяслоў I спражэння «хацець»); дзеясловы «ненавідзець», «цярпець», «вярцець», «гнаць», «залежаць», «спаць», «стаяць», «баяцца».

Усе астатнія дзеясловы належаць да **I спражэння**.

У сучаснай мове дзеясловы I і II спражэння – разнавіднасці тэматычнага спражэння: дзеясловы I спражэння – гэта дзеясловы з тэмай э (*е*), якая ў адных захавалася («нясеш»), а ў другіх фанетычна змянілася («хочаш»); дзеясловы II спражэння – дзеясловы з тэмай *і* («ловіш»). Тэматычныя галосныя ад канчатка не аддзяляюцца: «няс-еш», «лов-іш». Да нетэматычных дзеясловаў адносяцца дзеясловы «есці», «даць».

Рознаспрагальныя дзеясловы «бегчы», «есці», «даць» у розных формах могуць мець канчаткі I ці II спражэння або спецыфічныя канчаткі (гл. табліцу 2).

**Табліца 2**

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| 1-я | бяг-у, е-м, да-м | бяж-ым, ядз-ім, дадз-ім |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| 2-я | бяж-ыш, я-сі, да-сі | беж-ыце, я-сце, да-сце |
| 3-я | бяж-ыць, е-сць, да-сць | бяг-уць, яд-уць, дад-уць |

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ